# ДУБРОЎСКІ НАСТРОЙ № 112

ВЕРАСЕНЬ-КАСТРЫЧНІК 2008

НАРОДНЫ БАЯВЫ ЛІСТОК ДУБРОВА ПАРЫЦКІ ПАВЕТ

## Трохі пра ета.

То бок пра выбары, калі гэты парасячы віск можна назваць выбарамі.Як і ў прамінулыя гады кіроўная хеўра не прапусьціла практычна нікога з апазіцыйных грамадзян не то што ў дэпутаты, але нават у кандыдаты. Міласьліва былі дапушчаныя да выбараў назіральнікі, але назіраць практычна не было чаго. Якую пашану мела хунта да выбараў відаць па складу выбарчых камісій: яны фармаваліся з жанок самага сацыяльнага нізу, якімі можна кіраваць як трупам. Перад галасаваннем шацілкаўскя акулы папярэдзілі камісіі: як хочаце, але каб Кавалёва прайшла. Дык якія ж выбары!!!

На «передвыбарчае» абслугоўванне гэтай дамы быў кінуты апарат райвыканкама, міліцыя, кдб і дапаможнае сьмецце. Цяперашняя хунта так ірвалася да ўлады, што да самага апошняга моманту пра выбары амаль нічога не казалі. У Кабульшчыні нават перад саменечкмі выбарамі не было відаць аніякай інфармацыі ад кандыдатаў. То бок людзі не мелі магчымасьці скласьці пра апазіцыйнага кандыдата якоенебудзь ўражанне.

Пра праўладную Кавалёву багата людзей і чуць нічога не хацелі, правільна мяркуючы пра ейную абсалютную непатрэбнасьць для сябе.

Ладны кавалак выбаршчыкаўкаля чвэрці- наогул не бачыў сэнсу браць удзел у фарсе. «Я патрапіў у 25%!»- з гонарам заявіў нашаму карэспандэнту адзін мужчына ў Кабульшчыні. Менавіта столькі народу прайгнаравала выбарчае шоў у гэтай вёсцы.

Непрыгожымі былі паводзіны старшыні сельсавета сп. Крывалапа А. Ён езьдзіў па сёлах і падманьваў, што кандыдат Дайнека Сяргей - »бэнээфавец». Малады мужчына Сяргей Дайнека сам камуніст, у яго ёсьць сваякі ў Дуброве і тыя былі вельмі зьдзіўлены такой хлусьнёй. Зрэшты, разабраўшыся ў палітычнай прыналежнасьці Дайнекі ягоныя сваякі без ваганняў заявілі пра ўладу: «БНФ у сто разоў лепшае за іх».

Зьнешне выбары ў Дуброве прайшлі нудна. Праўда, назіральніку Міколу Клімавічу не дазволілі пабачыць, як захоўваецца нанач скрыня для датэрміновага галасавання. Што там паказваць: як хоча, так і захоўваецца.

Галасы лічылі шэптам, бюлетэні раскладалі па кучках. Усё гэта фігня. Галоўнае напісалі так, як было загадана.

За верную службу і пахучую гаўняную перамогу камісіі атрымалі падкупныя грошы. Тая сума, што была прадугледжана на магчымы другі тур выбараў пайшла на «ўзнагароду» ленам камісіі. На мінулых выбарах грошы, прадугледжаныя на магчымы другі тур выбараў, таксама пайшлі ў прызавы фонд, «джэк-пот», камісій.

Псеўдавыбары выклікалі адно агіду і самім працэсам іх падрыхтоўкі і правядзеннем.

Задаволіць яны могуць адно самы неразьвіты стары і старэчы пласт грамадзтва.

Не падпускаючы нікога на гарматны стрэл да кіравання краінай «беспартыйная» хеўра такімі «выбарамі» прыкрывае сваё флібусьцьерскае права багацець і рабаваць наш народ. Усе тыя, хто бралі ўдзел у галасаванні, падтрымалі багацеяў і нашкодзілі сабе.

Наўрад ці яны гэта ўсьведамляюць. Шчасьлівыя..

## РАССТРЭЛ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ.

71 год таму у 1937 годзе бальшавікі расстралялі за адну ноч два дзесяткі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Іх зарэзалі ў гонар гадавіны камсамола. Усіх жа закатаваных беларускіх літаратараў болей за 500! Бальшавікі выразалі ўсю беларускую літаратуру!

Сёлета нашчадкі катаў і ўлада глумліва і цынічна справілі 90 годдзе таталітарнай камуністычнай арганізацыі. Гэтым разам абышлося без рытуальных расстрэлаў.

## ЗЬМЕНА НАЧАЛЬНІКА.

Ледзь пасьпеў гароўны люд прызвычаіцца да новага начальніка, як тут жа зьявіўся навейшы.
Перад гэтым у канторы шчыравала нейкая рэвізія, кажуць нешта накалупала
Калупаць у нас умеюць.
Ніхто не ведае, чаму Зьмітра Іванавіча зьнялі.Калгаснае начальства ўпарта маўчыць, з гэтага можна зразумець, што яно было ім незадаволенае. Некаторыя неахвотна кажуць, што на ім ляжыць грэх срэбралюбства. Як бы тое ні было, а мусіў сп. Зьміцер падаць заяву на вызваленне ад пасады.
А простым пацоўным усёроўна: панскае жыццё калгасных дырэтараў не надта даўгавечнае.
Праўда, ўсе дазналіся, што Друзік Сяргей /Дзедка/, некалі меў з новым старшынём справу і характарызаваў яго як непаганага чалавека. І то добра.
Канешне, патомкам было б цікава прачытаць гісторыю калхозных начальнікаў у Дуброве, але гістарыяграфа ў калхозі няма. Давядзецца гартаць падшыўку шацілкаўскай манейкі ды нашага баявога лістка. Ды шукаць штосьці па архівах. Але дакуманты эмоцый не маюць.
Бывай, Зьміцер Іванавіч!
Сардэчна вітаем, Мікалай Кірэевіч!

## ПАГАНЫЯ ПАВОДЗІНЫ.

Сёлета няблага ўрадзіла наша легендарная нацыянальная культура- картоплі. Канешне, канешне, найвышшы ўраджай у калгаснага начальства. І дзякуй Богу!
Але аднаму калгаснаму начальніку-брыгадзіру ласка Божая закружыла галаву.
Недалёка ад ягонай штабной кватэры адстаўная навучыцельніца -назавом яе Галінай Паўлаўнай- пасеяла адну латачку жыта на лета.
Мо для ціпак ці парсючка.
І як чалавеку з нікчэмнымі эканамічнымі магчымасьцямі латачка тая была ёй вельмі дарагая . А маладзячына-брыгадзір з вяршыні сваёй моцы і магчымасьцяў ніяк не зважаў на руньусё вазіў і вазіў свае ўрадлівыя картоплі і таптаў маладыя жытнёвыя ўсходы.
Адстаўная навучыцельніца спрабавала ўшчунуць і прысароміць расьперазанага земляроба, але той, разьятраны перспектывай будучай нажывы ад продажу халяўных картопляў ніяк не зважаў на клопат жанчыны і на”т- зь яе словаў-наравіў праехаць па збажыне, каб болей нарабіць шкоды.
Жанчына баіла пра сваволле калгасьніка са скрухай: шкада і маладой руні і крыўдна ад чалавечай чэрствасьці.
Добра, калі такія людзі не затрымаюцца ў Дуброве. Але, Божа крый, калі беларускі дыктатар прымацуе такія кадры пажыццёва да калхозу, то гора нядужым і слабым.
Затопчуць.

## Пахарашнела

Ці то ў зьвязку з меркаваным «аграмястэчку», ці то з клопату пра гожства шашы паўз дарогу павалялі ўсе старыя бярозы.
Частку дрэў вывезьлі, а драбнейшае ламачча закапалі ў ямы.
Хто меў магчымасьць, той мог навазіць сабе дроў.
Яно-то праўда, дарогу прыладзілі, зрабілі зьезды і масткі з трубамі, пашырылі праезную частку. Няблага выглядае цяпер шаша.

## ДРАПЕЖНІЦЫ Ў ШКОЛЕ.

Не пасьпеў пачацца і акрэпнуць навучальны год у дуброўскай школе як з Шацілак прымчалася каманда баб з БРСМ
Як драпежнік з паднябеснае высі выглядае сабе спажыву і потым сокалам-сапсанам абрынаецца на ахвяру, гэтак і шацілкаўскія маладзіцы ўвесь час нікаюць па школах, скрабуць па сусеках маладыя душы ў свае ўчэпістыя ручкі. Чым болей душ яны завярбуюць, тым пэўнейшая і смачнейшая будзе іхняя луста хлеба з каўбасою, у народзе празваная «сэндвіджэ»
Дзеці хоць і малыя, але бачаць , што ніякай выгоды ад таго бэрэсэму мець не будуць, к.к. дз./каэфіцыент карыснага дзеяння/ дзевак набліжаецца да нуля.Таму і не праявілі яны асаблівага энтузіязьму, каб папоўніць шарэнгі і плаціць членскія ўзносы.
Тады вярбовачныя маладзіцы адкінулі пернік і дасталі з-пад сьцягна пугу. »Вы ўсёроўна ад нас нікуды не дзенецеся»- па-. сталіліся яны.
Кіньце, маладзіцы! Ета без Бога- ні да парога, а без вас, як без таго жыда, кірмаш будзе.
Хлопцы і дзеўкі!
Не лезьце ў антыбеларускую хеўру пад назовам бэрэсэмэ!
Лепей схадзіце ў рыбу ці ў грыбу.

## ВІЗІТ З АМЭРЫКІ.

У верасьні з далёкай старонкі з Амэрыкі, завітаў да нас былы старшыня арцелі незабыўны Леў Барысавіч Сьпевак. Менавіта ён перайменаваў калхоз «Шлях да камунізму» на «Дуброва».Ён і дзетак дуброўскіх адпраўляў на аздараўленне.
Леў Барысавіч добра выглядае, бо штодня мыецца ў Атлантычным акіяне.
А мы не мыемся, бо лазьні няма. Кака.

## МЕТАМАРФОЗА

З сярэдняй у базавую перахрысьцілі Кабульскую школу. Дзяцей паменела. Стала роўна 56 дзіцячых душ.

За етыя 10 месяцаў па сельсавеце нарадзілася мо 8 дзяцей, а выправіліся ў далёкую дарогу 40 чалавек

Ужо які год суадносіна нараджальнасьці і сьмяротнасьці стабільна трымаецца прапорцыі 1:5. Ці не пра гэтую жудасную стабільнасьць кажа беларускі дыктатар, калі хваліцца ею?

Дык вось задача для трэцяга класа: колькі трэба гадоў, каб вымерла ўсё дачыста насельніцтва Кабульскага сельсавету разам з начальствам? Астатнія зьвесткі спытайце ў свайго дэпутата сельсавета.

### ПАДРАМАНТАВАЛІ

Цяпер, як ужо амаль няма каго вучыць, дзяржава падрамантавала школы: і Дуброўскую і Кабульскую.

У Дуброві пасьля рамонту тры месяцы непрацуе школьная сталоўка, а ў класах холадна.

У Кабульскай школе падлогу заслалі лінолеумам і ў школе цёпла.

### НАСЯДАЮЦЬ.

А на настаўніц тым часам усё болей насядаюць зьверху.

Не мінае года, каб верхняе начальства- сапрўдныя вампіры- не прыдумалі якіх-небудзь новых папер, якія мусяць складаць настаўніцы.

Ім і пра ўрокі няма калі падумаць.

### ЧАМУ ГЭТА ТАК?

Таму што міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў ёсьць класавы школьнік. Ён займаецца стварэннем некай новай партыі ў працоўны час.Дык калі яму дбаць пра адукацыю? У гебельсы хоча патрапіць, няйна-чай.

### ЯКАСЬЦЬ ПАДАЕ.

А тым часам якасьць адукацыі падае проста на вачах. Дыктатар загадаў зрабіць рэформу школы, пярэчыць яму мала хто адважыўся і вось зараз дзеці мучацца па нейкіх новых праграмах. Наша лянівае і абыякавае грамадства спакойна дазваляе зьдзекувацца з дарослых і дзяцей. Ніякіх пратэстаў!

У Італіі, дзе дужа разумная баба-міністр адукацыі прыдумала рэформу, бунтавалі і вучні і настаўнікі. У Францыі, настаўнікі паставілі гарады на вушы. У нас жа ўсім усё роўна.Так нас навучыла школа, так нам надукавалі настаўніцы. Іх, бедных, душаць, з панта-лонаў давялі да матузкоў (так па-нашаму «стрынгі»), а яны, затурканыя, зьняважаныя, ўсё затыкаюць рот неасьцярожным вучням, пішуць процьму бессэнсоўных папер.

Не чакайце граматы ад дзяцей, калі на”т у міністэрстве адукацыі пішуць з памулкамі па-нашаму.

ДАЛОЎ ШКОЛЬНУЮ РЭФОРМУ!
ДАЛОЎ МІНІСТРА РАДЗЬКОВА!
ДАЛОЎ ІНІЦЫЯТАРАЎ РЭФОРМЫ!
РАСПУСЬЦІЦЬ АНТЫНАРОДНАЕ МІНІСТЭРСТВА АДУКЦЫІ!



## ПАГОРШАЛА

становішча незалежнага друку ў Беларусі. Праўда, багата людзей пра гэта не ведае, бо таго друку ў вочы не бачылі.

А пра што не ведаеш, па тым не пагібаеш..

## ЗЕЛЯНЕЕ РУНЬ.

Чытацкая грамадзкасьць «ДН» зьвярнула ўвагу на зялёную рунь, што шчодра ўзышла на скрутках саломы, складзеных ля в. Раковічы.

Нам прапанавалі паехаць і пабачыць тое гідрапоннае дзіва.

Але дзіва ніякага німа. Гамонячы пра рэкордавыя намалоты ў бункернай вазе органы прапаганды ніяк не ўпамінаюць жніўных страт. А яны немалыя. І не таму, што бункеры цяклівыя ці трактарысты лянівыя. Проста камбайны гаўняныя. Дыктатар строга забараніў купляць лепшыя еўрапейскія камбайны і загадаў набываць гомельскія. Каб падтрымаць свайго вытворцу. Такая аўтаркія вылазіць бокам. У выніку - немалыя страты збожжа.

Так што дзіва ніякага няма.

Тут прыемна адно: людзі перажываюць за бязладдзе ў сваёй краіне.Таму дзякуем за тое, што падказуеце.

## РАСЕЯ НЕ ХОЧА БЕЛАРУСКАГА МАЛАКА.

Расейская імперыя ўсяляк хоча нарабіць брыдоты сваім былым калоніям. От зараз дайшла чарга да Беларусі: павярцеўшы насамі маскалі сказалі «кака»беларускаму малаку. Толькі некалькім малочным фабрыкам дазволена пастаўляць сваю прадукцыю ва ўсходнюю імперыю.

Расея спаквяля рыхтуе свой рынак для свайго вытворцы.

У Расеі збудаваныя вялізныя жывёлагадоўчыя комплексы, якія сваёй прадукцыяй зоймуць расейскі рынак, а потым абрынуцца і на беларускі. Тады трымайся, калхозны дыктатар!

Працоўныя мусяць цікавіцца эканомкай, бо ад ейнага стану залежыць дабрабыт.

## БЕЛАРУСКІ ДЫКТАТАР-ДВОЕЖЭНЕЦ?

Люд працягвае сачыць і гідліва каментаваць ваенна-палявую прэзентацыю новага сынка беларускага дыктатара.

Паколькі мужчыны не раджаюць, то вісіць у паветры праклятае: хто ж яму даець? І з якіх меркаванняў? З сваёй законнай жонкай Галінай Радзівонаўнай ён не жывець і не чутно, каб разьвёўся, як той распусьнік французкі прэзідэнт Мікалай Шаркозь.

Тады міжволі і лагічна падумаць, ці то наш хакеіст двоежэнец, што забаронена беларускім законам, ці то таемны мусульманін, дзе палігамія дазваляецца шарыятам. А можа быць раб Божы Міколка- прадукт сурагатнай маткі і народжаны за грошы?

Няўклюдная прэзентацыя Міколкі спарадзіла процьму зьедлівых плётак і абурэнне.

Дыктатар заклікае народ мацаваць беларускую нацыянальную манагамную сям"ю, а сам тонее ў селадонстве, юры і палігамстве. Ды шчэ змушае заслужоных беларускіх генералаў аддаваць рапарт маленечкаму плоду грэшнага ? кахання.

Народ хоча ведаць праўду пра таямнічага Міколку. Бо ён жа наканаваны нам у царонкі.

## РАСЕЯ ХОЧА

каб Беларусь прызнала «незалежнасьць» дзвюх украдзеных у Грузіі тэрыторый Паўднёвай Асетыі і Абхазіі.

«Незалежнасьць» двух новых царстваў прызналі некалькі другарадных рэжымаў.

У нашым выпадку прызнаць іхнюю «незалежнасьць» - гэта як пажаваць гаўна.Гэта разумее беларускі дыктатар і таму пакуль трывае паўзу.

І правільна чыніць: іхнія праблемы- гэта не наша справа. Расея заварыла каўказкую кашу 180 гадоў таму, хай сама і тлуніцца ёю.

**ПАТАЛОГІЯ.**

Расеі даўно трэба лячыцца ў псіхбальніцы, бо яна шалёным псом кідаецца на ўсе бакі: то Фінляндыя, то Прыб балтыка, то Венгрыя, то Чэхаславаччына, то Аўганістан, то Грузія. Усе яе, бедную, крыўдзяць. Паціху цягне яна свае шалудзівыя ручкі да Малдовы, Украйны, Беларусі. Усюды хоча насадзіць шчасьце двухгаловага драпежнага арла.

Мы патрабуем усталявання міжнароднага пратэктарату над Расеяй дзеля абароны правоў народаў Сіберу і Поўначы на іхнія газ і нафту.

## КАНЦЛАГЕРЫ ДЛЯ НЕГАДЗЯШЧЫХ БАЦЬКОЎ.

Колькасьць занядбаных бацькамі дзяцей у нашай краіне пастаянна расьце. Дагэтуль дзяржава канфіскавала такіх дзяцей і вучыла іх сама. Але зараз, відаць, на гэта грошай шкада і каб нояк даць рады дыктатар пасталіўся зьмяшчаць негадзяшчых бацькоў у лагеры, хоць німа такога закону..

Для любой дыктатуры, як заўважыў некалі Джордж Орвэл, такога панятку як закон не існуе, галоўнае - сіла. От і зараз наш дыктатар не кажа, што спыніць спойванне народу танным пойлам. Прашчэй тых, хто п"е і аддае за гэта грошы дзяржаве, сілаю саджаць ў лагеры. А пасадзіць туды трэба начальства пойлагонных заводаў, райнепатрэбсаюзу, дэпутатаў мясцовых Саветаў.

А не п"яніц-бацькоў. І шчэ даць мешалкаю па палойках уладзе.

## ЗАЛЕЗНАЯ ЛАЎКА

адчынілася ў Дуброве. Тавараў там ладнага, але ці хапае ў дуброўцаў грошай, каб накупляць іх? Канешне, час ад часу залезныя тавары дома патрэбны, але, пэўне, ад эканамічнага разьліку рэальнасьць далекава. Хутчэй гэта прапагандысцкі крок зьвязаны з піханнем Дубровы ў аграмястэчка.

**УКРАЛІ ЛІСАПЕТ.**

Пазнавата ўвечары Коля Друзік прыехаў у залезную лаўку, каб памагці жонцы раскласьці тавары. Лісапет ён кінуў ля лаўкі.

Кал, лічы ўночы, ён выйшаў з лаўкі, то лісапету не было.

Назаўтра, калі Коля ізноў шукаў лісапет , да яго падышоў мужык, што жыве недалёка і прапанаваў за грошы «знайсьці» веламашыну. Замест грошай Мікалай прапанаваў пазнаёміцца з міліцыяй. І лісапет як бачыш знайшоўся ў траве за агародамі.

Заўчасна пайшоў ад нас
добры беларус,
добры чалавек
**Блінкоўскі**
Васіль Арсеняў.
Усім нам будзе неставаць
гэтага спакойнага разважнага
мужчыны.
Хай атуліць Бог яго сваёй
ласкай.

Заўчасна пайшоў ад нас
добры беларус,
добры мужчына
**ШЧЭРБІН**
Віктар Хведараў.
Божа, не адрынь раба Твайго
Віцю. Хай будзе праклятых
«Цэнтраўвоз».

Пасьля хвароб і цяжкага
небуту адыйшла ў лепшы
сьвет душа добрай беларускі
**БУСЕЛ**
Кацярыны Іванавай.
Яна была найлепшай
прамоўніцай Дубровы.
Забыць яе цяжка.
Хай Бог атуліць яе ласкай.

Друкарня імя І. Масьціцкага 100 ас.